

# «Чалавек вялікай душы і таленту Іван Пятровіч Шамякін»

(30.01.1921 – 14.10.2004)

105-гадоў з дня нараджэння

Кніжная выстава

*Іван Шамякін – выбітны беларускі пісьменнік, драматург, сцэнарыст і грамадскі дзеяч, Народны пісьменнік Беларусі. Яго пяру належаць такія вядомыя творы, як “Сэрца на далоні”, “Снежныя зімы”, “Атланты і карыятыды”, “Вазьму твой боль”, “Петраград – Брэст”, “Зеніт” і інш.*

*Шамякін пачаў свой літаратурны шлях у першыя пасляваенныя гады, у вельмі складаны і адказны час для развіцця літаратуры. Вярталіся з франтоў і партызанскіх атрадаў старэйшыя пісьменнікі, уважліва прыглядаліся да першых крокаў мірнага жыцця. У памяці былі яшчэ свежыя ўспаміны пра вайну. У той няпросты час рабілі першыя творчыя спробы яшчэ нікому не вядомыя маладыя літаратары, сярод якіх быў і Іван Шамякін. Малады пісьменнік пачаў літаратурную дзейнасць з адлюстравання ваеннай тэмы.*

*Дэбютным творам стала апавяданне “У снежнай пустыні”, якое было напісана ў перыяд 1944-1946 гг., а першым буйным творам – аповесць “Помста”, апублікаваная ў 1945 годзе ў беларускім часопісе “Полымя”. З таго часу і пачалася актыўная пісьменніцкая дзейнасць І.Шамякіна.*




*У цэнтры аповесці "Помста" — лёс маёра М. Раманенкі, у якога ў вайну загінулі маці, жонка і дачка. Герой твора, пылаючы помстай, воляй лёсу адшуквае сям'ю ката недалёк ад Берліна ў пераможным маі 1945-га. Аднак ці зможа адплаціць той жа манетай жонцы і дзецям Візэнера салдат-пераможца?*

*Прызнанне чытачамі не прымусіла сябе доўга чакаць. Папулярнасць аўтара была звязана з тым, што ён умеў распавядаць пра турботы чалавека, пачуцці і думкі, пра яго маральны і псіхалагічны стан так, каб захапіць чытача глыбокім сэнсам убачанага, адкрыць яму заканамернасць руху грамадства і гэтым самым дапамагчы заняць правільную пазіцыю.*

*Іван Шамякін адным з першых у савецкай прозе адчуў, што яго ўласны шлях салдата – гэта хоць і маленькая, але тыповая часцінка шляху, пройдзенага ўсім яго пакаленнем.*

Найбольшае прызнанне атрымаў раман аўтара “Трывожнае шчасце”.

“Мы заўсёды кахаем мацней, калі адчуваем, што каханню нашаму нешта пагражае”.

Гэтыя выдатныя словы аб каханні ўзяты з аповесці “Непаўторная вясна”, якая разам з іншымі (“Начныя зарніцы”, “Агонь і снег”, “Пошукі і сустрэчы” , “Мост”) увайшлі ў адзіны зборнік “Трывожнае шчасце”. Упершыню пенталогія выйшла ў свет у 1965 годзе. Магчыма, поспех “Трывожнага шчасця” заключаецца ў тым, што твор быў напісаны на аснове біяграфіі аўтара і жыцця блізкіх яму людзей.






*Галоўная гераіня рамана Тацяна Маеўская ў першыя дні вайны выратоўвае яўрэйскага хлопчыка. Бацьку і мачасе яна гаворыць, што гэта яе сын. Мачаха выдае Тацяну і расказвае аб гэтым нямецкаму агенту Мацею Куляшу. Пасля гэтага да тацяны завітваюць паліцэйскія, ды Тацяна праяўляе смеласць і рашучасць. Яна забівае фашысцкіх паслугачоў, а сама з дзіцем і бацькам падаецца ў партызаны, каб помсціць ворагам.*

*Сюжэт рамана «Зеніт» ахоплівае падзеі апошняга года вайны – ад пераможнага наступлення нашых войск на Карэльскім фронце летам 1944 года да Дня Перамогі. У цэнтры твора – маладыя салдаты зенітнага дывізіёна, іх клопаты, радасці, спадзяванні. Многія старонкі рамана расказваюць пра каханне, верную дружбу.*












***У рамане «Сэрца на далоні» ўзнімаюцца праблемы грамадзянскай адказнасці чалавека перад самім собой, народам, гісторыяй, асуджаюцца страх, які калечыў душы нават тых, хто шчыра ваяваў, занядбанне чалавечай маралі, кар’ерызм.***







***«Петраград — Брэст» раман расказвае аб тым складаным перыядзе гісторыі Савецкай дзяржавы, калі ў надзвычай цяжкіх для краіны абставінах заключаўся Брэсцкі мір. У творы найбольш поўна праявіліся ідэйна-мастацкая маштабнасць, партыйная заўзятасць і грамадзянская смеласць пісьменніка, які даў шырокую панараму рэвалюцыйнага руху мас.***

*Аповесці «Першы генерал», «Браняпоезд «Таварыш Ленін» і кінааповесць «Эшалон прайшоў» склалі кнігу прозы. Усе гэтыя творы — на ленінскую тэму.*









*У цэнтры аўтарскай ўвагі расказ пра лёс таго пакалення беларусаў, якое ў час вайны было дзецьмі і якое яна асіраціла. Але і дагэтуль ваенная трагедыя адгукаецца ў жыцці людзей і нярэдка ломіць іх шчасце, як вось зламала, разбіла яна шчасце Івана Батрака, галоўнага героя рамана.*

*Напісаны ў 1953-1956 гг. Раман "Крыніцы" расказвае пра вялікія зрухі, якія адбыліся ў вёсцы. У цэнтры рамана - калгаснікі, вясковая інтэлітенцыя.*






*Раман «Атланты і карыятыды» ў свой час набыў фенаменальную папулярнасць не толькі ў Беларусі. Здольнасць пісьменніка пранікаць у побыт савецкага грамадзяніна - партыйнага работніка, старшыні калгаса, дойліда, медыка - прынесла яму заслужаную вядомасць. Партрэт галоўнага героя - архітэктара Максіма Карнача - шмат у чым спісаны з сябра Івана Шамякіна, драматурга Андрэя Макаёнка, вядомага сваім жыццялюбствам, гумарам, прыхільнасцю да жанчын. Пісьменнік проціпаставіў свету чыноўнікаў і бяздарных архітэктараў накшталт Макаеда людзей творчых, жывых, шчырых. І пераканаў чытача, што менавіта яны - сапраўднае апірышча грамадства, яго атланты і карыятыды*

*“Злая зорка” – першы беларускі раман аб Чарнобылі. У цэнтры – вобраз старшыні райвыканкома Уладзіміра Пыльчанкі. На яго плечы кладзецца цяжар ліквідацыі вынікаў аварыі. Паказаны лёс яго сям’і: малодшы сын Глеб – інжынер атамнай станцыі – цяжка хварэе, старэйшага Барыса – афіцэра-лётчыка – другі раз пасылаюць у Афганістан, там ён і гіне. Не вытрымлівае матчына сэрца… Апрача таго, у рамане ёсць і жыццесцвярджальны пачатак: нараджэнне ўнука Валодзькі.*









*Палеская Мадонна (зборнік)*
*У аповесці аўтар працягвае распачатую раней у рамане «Злая зорка» тэму Чарнобыля. Але цяпер яго цікавяць ужо наступствы гэтай катастрофы, тое, як сацыяльная трагедыя паступова ператварылася ў асабістую трагедыю чалавека.*

*Іван Шамякін – гэта феномен беларускай літаратуры, летапісец сваёй эпохі. За сваё доўгае жыццё пісьменнік напісаў вялікую колькасць літаратурных твораў, якія сталі класікай беларускай літаратуры .*